


**ЛІПІНСКІ Цімафей**
**(1797г.)**

Беларускі і польскі гісторык, географ, філолаг, калекцыянер, краязнавец (нарадз. у мяст. Дзярэчын Зэльвенскага р-на). Брат К. Лявоцкай. З сям'і памешчыка. Рана страціў бацькоў.

Пачатковую адукацыю атрымаў у родных мясцінах. Пад апекаю дзядзькі вучыўся ў ліцэі ў Варшаве (з 1811г.). У 1825 годзе скончыў мастацкі факультэт Варшаўскага універсітэта. Быў ад'юнктам у палітэхнічным інстытуце ў Варшаве. Удзельнік паўстання 1830-31гг., вёў падрабязны дзённік паўстання выдадзены ў Кракаве ў 1881г. як "Нататкі з (1825-1831 гг.").

Выкладаў гісторыю і геаграфію ў акруговай, затым павятовай рэальнай школе ў Варшаве (1833-51гг.).

Быў сталым супрацоўнікам "Biblioteki Warszawskiej" у 1842-54гг.

Шмат падарожнічаў па Беларусі і Польшчы як краязнавец, даследчык даўніны. Збіраў рукапісы, манеты, дакументы, медалі, творы фальклору, тапонімы.

Навуковую працу вёў з часоў студэнцтва. З М. Валійскім выдаў даследаванне "Старажытная Польшча з гістарычнага, геаграфічнага, статыстычнага пунктаў гледжання". Т. 1-3 (Варшава, 1843, 1846, 1850). Пазней Ф. Марціноўскі падрыхтаваў 2-е, дапоўненае выданне (Т. 1-4, Варшава, 1885-86). У "Bibliotece Warszawskiej"друкавалася яго гісторыя газет у Польшчы, "Гістарычныя драбніцы з XVIII ст.", а таксама "Слоўнік прыказак, прытчаў, афарызмаў і спосабаў выказвання".

Падрыхтаваў адзін з найбольш значных для таго часу прыватных нумізматычных збораў. Склаў збор біяграфій вядомых людзей Рэчы Паспалітай XVIII ст. Быў сябрам навуковага таварыства ў Кракаве, геаграфічнага таварыства ў Пецярбургу, таварыства сяброў навук у Варшаве.

Памёр у 1856 годзе.

**Бібліяграфія**


1. **Биография Липинский Тимофей** [Электронный ресурс]. - Режим доступа: https://biographiya.com/lipinskij-timofej/. - Дата обращения: 30.11.2022.
2. **Липинский Тимофей // Люди науки Зельвенщины**: информационно-краеведческий буклет к Году науки / Сост. С. В. Гецман. — ГУК “Зельвенская районная библиотека”. — 2017. — С. 8—9.
3. **Липинский Тимофей** [Электронный ресурс]. - Режим доступа: https: // dic. academic. ru / dic. nsf /enc_biography/72026/Липинский. - Дата обращения: 30.11.2022.
4. **Ліпінскі Цімафей //** “Знакамітыя людзі Зэльвеншчыны – юбіляры 2022 года”: інфармацыйна-краязнаўчы буклет. Выпуск 6 / склад. С. В. Гецман. — Зэльва: ДУК “Зэльвенская раённая бібліятэка”, 2022. — С. 6—7. — (Серыя: “Краязнаўчы каляндар”).
5. **Ліпінскі Цімафей** // Нашы славутыя вучоныя-землякі: інфармацыйны флаер / ДУК “Зэльвенская раённая бібліятэка”; склад. С. В. Гецман. — Зэльва. — 2020. — С. 20—21.
6. **Ліпінскі Цімафей** // Памяць. Зэльвенскі раён: Гісторыкадакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі / Рэдкал.: У. С. Богаў, Т. П. Броска, І. І. Васілеўка і інш. ; Уклад. Т. П. Броска ; Маст. Э. Э. Жакевіч. — Мінск : Паліграфафармленне, 2003. — С. 420—421.